15. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 565. Оп.13. Д. 2708.
16. РГИА. – Ф. 565. Оп. 13. Д. 2763.
17. Свод законов Российской империи издания 1857 г. – СПб. : Тип. 2-го отделения собственной е.и.в. канцелярии, 1857. – Т. 5 : Свод уставов о податях.
18. *Стегний, П. В.* В тени восьмиконечного креста. Мальтийский орден и его связи с Россией / П. В. Стегний. – М. : Международные отношения, 2013. – 350 с.

УДК 94 : 379.81 "18/19" (476)

# ВЫЯЗНЫ МЕДЫЦЫНСКІ ТУРЫЗМ У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ У СЯРЭДЗІНЕ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

**А. Л. Зянько**

*Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, вул. Крапоткіна, 55, 220002, г. Мінск, Беларусь, aksana.zenko@yandex.ru*

У артыкуле разглядаюцца пытанні развіцця медыцынскага турызму ў краіны Заходняй Еўропы з беларускіх губерняў у сярэдзіне XIX – пачатку XX ст.

***Ключавыя словы***: медыцынскі турызм; курорт; санаторый; лячэнне; аздараўленне.

# ВЫХОДНОЙ МЕДИЦИНСКИЙ ТУРИЗМ В БЕЛОРУССКОЙ ПРОВИНЦИИ В СЕРЕДИНЕ XIX – НАЧАЛЕ XX в.

**А. Л. Зенько**

*Национальный исторический архив Беларуси, ул. Кропоткина, 55, 220002, г. Минск, Беларусь, aksana.zenko@yandex.ru*

В статье рассматриваются вопросы развития медицинского туризма в страны Западной Европы из белорусских губерний в середине XIX – начале XX в.

***Ключевые слова***: медицинский туризм; курорт; санаторий; лечение; оздоровление.

# OUTGOING MEDICAL TOURISM IN THE BELARUSIAN PROVINCES IN THE MID-XIX – EARLY XX CENTURY

**A. Zenko**

*National Historical Archive of Belarus, Kropotkin str. 55, Minsk, Belarus aksana.zenko@yandex.ru*

The article deals with the development of medical tourism to the countries of Western Europe from the Belarusian provinces in the middle of the XIX – early XX century.

***Keywords:*** medical tourism; resort; sanatorium; treatment; recovery.

Медыцынскі турызм сёння з'яўляецца адным з найбольш запатрабаваных відаў турызму. Ён уяўляе сабой практыку прадстаўлення медыцынскіх паслуг (дыягностыка, аздараўленне, рэабілітацыя) за межамі пражывання асобы і, у большасці выпадкаў, сумяшчае лячэнне і адпачынак (сумежныя катэгорыі лячэбна-аздараўленчы, лячэбны турызм) [6]. Нягледзячы на тое, што сам тэрмін «медыцынскі турызм» узнікае ў другой палове XX ст., як з'ява гэта адзін з найбольш ранніх відаў турызму і вядомы на беларускіх землях яшчэ ў Ранні Новы час. Аднак ў гэты перыяд паездкі з мэтай аздараўлення, у першую чаргу ў краіны з унікальным кліматам і развітымі традыцыямі лячэння, былі нерэгулярнымі, адзінкавымі выпадкамі, і датычыліся вышэйшага шляхецтва.

Рэгулярна наведваць розныя замежныя лячэбныя ўстановы, мінеральныя і марскія курорты прадстаўнікі сацыяльнай эліты беларускага грамадства пачынаюць у першай палове XIX ст. Такія паездкі з'ўляліся не толькі магчымасцю паправіць здароўе, але і неабходным доказам статуснасці, адпаведнасці саслоўным правілам.

У сярэдзіне – другой палове XIX ст. прадстаўнікі заможных слаёў грамадства па-ранейшаму аддавалі перавагу лячэнню і аздараўленню за мяжой, што пацвярджаюць архіўныя дакументы аб выдачы замежных пашпартоў. Да таго ж, першыя асобы дзяржавы таксама лічылі за лепшае атрымліваць там медыцынскія паслугі. Так «Аляксандр II шматразова, а першы час кожны год, адпраўляўся на курорт Эмс, паколькі пакутаваў ад жоўцева-кішэчнага захворвання. Імператрыца Марыя Аляксандраўна была хворая на сухоты і павінна была карыстацца сухім кліматам поўдня Францыі» [17, с. 256]. Аднак даволі складана вылічыць дакладную колькасць медыцынскіх турыстаў з беларускіх губерняў у гэты час. У алфавітных кнігах выдачы замежных пашпартоў розным асобам у канцылярыях губернатараў ўлік вёўся без пазначэння мэты паездкі – толькі дата выдачы і тэрмін дзеяння. У гэтыя спісы траплялі людзі, якія адпраўляліся на лячэнне і адпачынак, па камерцыйных справах, для выканання службовых абавязкаў і інш. Больш канкрэтная інфармацыя ўтрымліваецца ў хадайніцтвах на імя губернатара аб выдачы замежных пашпартоў, дзе неабходна было ўказаць мэту падарожжа і краіну, куды накіроўваўся прасіцель. Так у 1854 г. у канцылярыю Мінскага грамадзянскага губернатара А. Скірмунт дасылае прашэнне аб павелічэнні тэрміну яе знаходжання за мяжой і даведку ад рымскага ўрача, які хадайнічае аб прадаўжэнні лячэння [7, арк. 22]. Гомельскі павятовы маршалак шляхты, стацкі саветнік А. Б. Станевіч разам з прашэннем на імя магілёўскага губернатара аб шасцітыднёвым адпачынку і выдачы замежнага пашпарту падаў медыцынскую даведку ад гарадавого ўрача аб неабходнасці санаторнага лячэння ў Германіі, на курорце Бад-Наугейм [8, арк. 44]. Рагачоўскі павятовы маршалак шляхты А. Кігн хадайнічаў

аб унясенні ў яго замежны пашпарт жонкі, якой пасля аперацыі рэкамендавана лячэнне ў Швейцарыі [8, арк. 68]. Наваградскі памешчык А. Брахоцкі просіць выдаць замежныя пашпарты сабе і сваёй сям'і для адпачынку і лячэння за мяжой [8, арк. 54 адв.], з аналагічнай просьбай звяртаецца павятовы маршалак шляхты І. А. Іосса і інш.

Неабходна ўлічваць, што колькасць людзей, якія карысталіся медыцынскімі паслугамі за мяжой, значна большая ў параўнанні з колькасцю прашэнняў, бо ў пашпарты ўпісвалі членаў сям'і, бралі кампаньёнаў і прыслугу. Напрыклад, памешчыца Мінскай губерні Э. Гартынг прасіла ўпісаць у яе замежны пашпарт шасцёра дзяцей, а таксама выдаць пашпарты чатыром слугам, якія павінны былі суправаджаць яе за мяжу на адпачынак і лячэнне [9, арк. 262]. Такім чынам яшчэ ўзнікае пытанне, да якой катэгорыі адносіць прыслугу, якая адпраўлялася за мяжу разам з гаспадарамі. Аб тым, што яна таксама мела магчымасць карыстацца пэўнымі медыцынскімі паслугамі, сведчыць той факт, што ў прэйскуранце на паслугі ў некаторых санаторыях і лячэбніцах запісана спецыяльная цана для прыслугі [14, арк. 74].

З 1880 г. у справах аб выдачы замежных пашпартоў знаходзяцца дакументы пад назвай «Пасведчанне аб адсутнасці перашкод да выезду за мяжу». Яны даюць больш дакладнае ўяўленне аб асобах, якія накіроўваліся за мяжу для адпачынку і лячэння, бо ўтрымлівалі інфармацыю аб мэце паездкі [10].

Калі ў першай палове XIX ст. хадайніцтвы падавалі, за рэдкім выключэннем, дваране і чыноўнікі, то ўжо ў сярэдзіне XIX ст. сустракаюцца прашэнні аб выдачы замежных пашпартоў для лячэння і адпачынку за мяжой ад прадстаўнікоў іншых саслоўяў. Напрыклад з сакавіка па май 1858 г. мінскім губернатарам былі задаволены два прашэнні купцоў-яўрэяў і адно мінскага мешчаніна-яўрэя [11], а ў 1863 г. са 113 дазволаў на замежнае лячэнне 18 атрымалі яўрэйскія купцы і мяшчане [9]. Але неабходна заўважыць, што замежныя пашпарты для яўрэяў выдавалі тэрмінам толькі да шасці месяцаў, у той час як іншым грамадзянам да трох гадоў, а некаторым дваранам – да пяці.

Развіццё замежнага медыцынскага турызму стрымлівала забюракратызаваная і строга рэгламентаваная працэдура атрымання замежнага пашпарту. Згодна са Статутам аб пашпартах і беглых (артыкул 269), ён выдаваўся ў першую чаргу «расійскім падданым, асобам і чынам, прозвішчамі сваімі або званнем, якія заслугоўваюць павагу, і на давер ўрада права мець могуць» [15]. Але нават такім асобам неабходна было сабраць значную колькасць даведак: медыцынскую ад павятовага ўрача, які рэкамендаваў лячэнне за мяжой, земскага іспраўніка аб адсутнасці нядоімак і не ўдзеле ў паўстанні 1830–1831 гг. (або 1863–1864 гг.), ад паліцмайстра аб адсутнасці крымінальнага і грамадзянскага праследавання, характарыстыку і паручыцельства ад губернскага прадвадзіцеля дваранства. Да таго ж, прыкласці асабіста напісанае абавязацельства, што пад час знаходжання за мяжой

прасіцель будзе паводзіць сябе належным чынам. Напрыклад такія дакументы прадставіў граф О'Рурк [7, арк. 1–5 адв.]. Але нягледзячы на пералічаныя цяжкасці, згодна спісаў, якія былі прадстаўлены Мінскаму губернатару, у студзені 1863 г. за мяжой знаходзілася 11 памешчыкаў губерні з сем'ямі, у чэрвені гэтага ж года – 47 [9]. Кожны год у адпачынак і лячэнне за мяжу адпраўляліся прадстаўнікі эліты грамадства: Ваньковічы, Чапскія, Вайніловічы, Свяцціцкія, Ракіцкія і інш.

Актывізацыя медыцынскага турызму ў беларускіх губернях у 70–80-я гг. XIX ст. была абумоўлены мадэрнізацыяй беларускага грамадства. Яна «прадстаўляла сабой комплексную з'яву, якая закранала розныя сферы жыцця – эканамічную, сацыяльную, палітыка-прававую, культурную. З ёй шчыльна звязаны працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, станаўлення нацыі, змен у менталітэце насельніцтва, фарміраванне іерархічнай сацыяльнай структуры грамадства» [4, с. 31]. Мадэрнізацыя суправаджалася з'яўленнем сярэдняга класа, які меў фінансавыя магчымасці і пэўны вольны час для арганізацыі свайго адпачынку. Да таго ж, клапаціцца аб сваім здароўі ў гэты перыяд становіцца папулярнай тэндэнцыяй, аб чым сведчаць медыцынскія заключэнні ўрачэбных аддзяленняў губернскіх праўленняў. Напрыклад у першай палове 1870-х гг. Мінскае ўрачэбнае аддзяленне выдала звыш 50-ці рэкамендацый ад неабходнасці курортна-санаторнага лячэння і аздараўлення [13]. Сярод іх уладальнікаў ужо трапляюцца людзі рознага сацыяльнага статусу: дваранін Пінскага павета Д. А. Кастравіцкі, мінскі настаўнік В. Л. Ісачанка, надворны саветнік В. Нерліх, наваградскі памешчык І. С. Нарылевіч, купец Д. Шейнфенкель, калежскі асэсар Ю. Рамашка, граф К. О'Рурк, яўрэйская мяшчанка Ф. Дзеляціцкая, прыстаў І. Ярэміч і інш. У пераважнай большасці пратаколаў медыцынскіх аглядаў запісана, што знаходжанне на замежных курортах гэтым людзям неабходна, або можа быць карысным. Паказальным з'яўляецца тое, што каталіцкім святарам у выдачы даведак і замежных пашпартоў было адмоўлена. Забаранілі выезд на італьянскі курорт і памешчыцы Навагрудскага павета С. К. Кашыц, нягледзячы на прадпісанне павятовага доктара, станоўчую характарыстыку ад павятовага маршалка. Прычына адмовы – удзел яе мужа ў паўстанні 1830–1831 гг. і далейшая яго эміграцыя [12].

Трэба адзначыць, што накіраванне на ўнутрыдзяржаўныя месцы адпачынку і лячэння атрымалі толькі тры асобы, астатнім рэкамендавалі адпраўляцца ў краіны Заходняй Еўропы, у большасці выпадкаў Германію, Аўстра-Венгрыю, Італію і Францыю.

У другой палове XIX ст. у беларускіх губернях па-ранейшаму большасць турыстаў складаюць прадстаўнікі заможнага дваранскага саслоўя. Адной з прычын такога становішча з'яўляецца незавершанасць працэсу фарміравання сярэдняга класа і інтэлігенцыі. У той час як ва ўнутраных губернях Расійскай імперыі ўжо «пасля Крымскай вайны круг падарожнікаў з дваранскіх арыстакратаў стаў папаўняцца за кошт людзей сярэдняга дастатку – у прыватнасці журналістаў, вучоных, выкладчыкаў. Паездкі за

мяжу з гэтага часу ўваходзяць у звычай разначынцаў, якія займаюцца разумовай працай» [17, с. 257].

Вывучэнне архіўных крыніц паказвае, што ў толькі ў канцы XIX – пачатку XX ст. сацыяльны склад аматараў замежных курортаў значна пашырыўся. У яго ўключыліся прадстаўнікі тэхнічнай інтэлігенцыі, урачы, настаўнікі, купцы, прадпрымальнікі, багатыя мяшчане. «Адпачынак, вольны час не з’яўляецца тым канцэптам, які прывіваецца на любой глебе абсалютна не праблематычным спосабам. Пры самім сваім зараджэнні дадзенай ідэі патрэбны такія апраўданні, як здароўе, сацыяльны сэнс або рэспектабельнасць. Толькі пазней ён можа без усялякага сораму асацыіравацца з задавальненнем і рэлаксацыяй. Як і ў Заходняй Еўропе, курорт у Расіі адыгрывае важную восевую ролю ў працэсе пераходу ад арыстакратычнай летняй паездкі да таго, што нагадвае буржуазны летні адпачынак» [5, с. 163].

Аналізуючы даходы сярэдніх слаёў насельніцтва ў канцы XIX – пачатку XX ст. можна прыйсці да высновы, што паступовы рост дабрабыту дазваляў ім патраціць частку сродкаў на лячэнне і адпачынак. Так начальнік дэпо і інжынер на чыгунцы зараблялі 1 800 руб. у год, обермашыніст – 1200, [2, с. 193]. Сярэдні даход урача ў Мінску складаў 2 400 руб. у год, фельчара 420–600. Штогадовы заробак народнага настаўніка паводле закона 7 ліпеня 1913 г., з улікам даплаты за працоўны стаж, мог дасягаць 600 руб. у год [18, с. 54–56]. Зразумела, што не ўсе яны маглі дазволіць сабе дарагія паслугі, аднак прапановы ў гэтым кірунку былі вельмі розныя.

Максімальна інфармацыю аб замежных санаторыях і курортах можна было атрымаць ва ўрачэбных аддзяленнях губернскага праўлення, а таксама ў газеце «Курорты і лячэбныя месцы», што выдавалася ў Маскве і дасылалася ва ўсе губерні, так як мясцовая прэса недастаткова асвятляла гэта пытанне на сваіх старонках. Ахвотнікам адпачыць за мяжой раілі наведаць нямецкія курорты «Вільдунген», «Seelisberg», швейцарскія «Бадэн», «Гейштрых», французскія «Вітэль» і «Вагезы» і многія іншыя. У газеце рэкламуецца і вялікі спектр месцаў адпачынку не толькі ў Еўропе (Германія, Аўстра-Венгрыя, Швейцарыя, Англія. Італія, Іспанія, Нарвегія, Швецыя і інш.), але нават і ў Афрыцы – Алжыр, Егіпет, астравы Тэнэрыфа [14].

Аб зацікаўленасці замежных курортаў у турыстах гаворыць той факт, што яны пачынаюць засноўваць у буйных гарадах Расійскай імперыі свае прадстаўніцтвы, або ствараць пры ўрачэбных установах і аптэках, крамах і білетных касах інфармацыйныя пункты. Напрыклад, для прываблівання большай колькасці турыстаў, на венгерскім курорце «Песц’ен» ў маі – чэрвені 1912 г. нават правялі Міжнародны шахматны турнір [14, арк. 84].

Нямецкія курорты прадстаўлялі пяціразовае харчаванне, пражыванне ў асобным пакоі з «ложкам з бялізнай, ацяпленнем, асвятленнем, наведваннем урачоў, лабараторнымі даследаваннямі, наглядам медыцынскай сястры» ад 12 да 30 марак у суткі [14, арк. 84].

Афіцыйнае Швейцарскае даведачнае бюро, якое мела сваё прадстаўніцтва ў Санкт-Пецярбургу, апрача санаторыяў і курортаў, запрашала «людзей, якія падарожнічаюць для ўцехі і турыстаў», абавязкова наведаць краіну, так як «у Швейцарыі, якая жыве амаль выключна турыстамі, прыезджым гарантавана адсутнасць злоўжыванняў, чыстыя памяшканні гасцініц, сытная ежа за невялікія грошы» [14, арк. 83 ад.]. Так суткі пражывання ў гасцініцы з поўным пансіёнам каштавалі ад 5 франкаў (1,87 руб.) да 18 франкаў (6,75 руб.), а тыдзень падарожжа па краіне з пражываннем, харчаваннем, пераездамі і экскурсіямі прыкладна ад 20 франкаў (7,50 руб) да 25 (9,37 руб.) у суткі.

Значную інфармацыйную дапамогу пры арганізацыі медыцынскіх і аздараўленчых тураў у Заходнюю Еўропу можна было атрымаць выкарыстоўваючы складзены А. Старскім і выдадзены ў 1857 г. у Санкт-Пецярбургу «Дапаможнік для тых, хто едзе за мяжу», які вытрымаў два наступныя выданні. У кнізе змешчана падрабязная інфармацыя як арганізаваць замежнае падарожжа – правілы афармлення неабходных дакументаў, схемы найбольш папулярных маршрутаў, табліцы пераводу замежных грошай на рускія рублі, чыгуначныя і паштовыя тарыфы, апісанні курортаў, цэны на паслугі і інш. Напрыклад найбольш забяспечаным турыстам прапаноўвалася адпачываць у Вісбадэне дзе «гасцініцы адрозніваюцца асобай раскошай, у некаторых устроены купальні з мінеральнымі водамі, праведзенымі прама з крыніц». Для турыстаў таксама прапанавалі наведаць «“кургауз” (дом сходаў), дзе іх чакаюць музыка, балі, сходы, рулетка, тэатр і іншыя забавы» [16, с. 225].

Такім чынам, выбар заходнееўрапейскага кірунку выхадцамі з беларускіх губерняў быў звязаны з даўняй традыцыяй аздараўлення і адпачынку ў Заходняй Еўропе, тым больш да еўрапейскіх курортаў было тэрытарыяльна бліжэй, чым, напрыклад, да Каўказа. У другой палове XIX ст., дзякуючы эканамічнай мадэрнізацыі, развіццю транспарту, у першую чаргу чыгуначнага, перамяшчэнне турыстаў стала больш хуткім, надзейным, танным, Беларусь аказалася больш цесна звязанай з еўрапейскімі краінамі [1, с. 95]. Да таго ж, турыстаў у еўрапейскіх краінах сустракала падрыхтаваная інфраструктура: камфартабельныя гасцініцы і рэстараны, курортныя цэнтры, якія сталі не толькі лячэбнымі, але і вядомымі сацыяльнымі і гандлёвымі цэнтрамі, санаторыі з высакаякасныя медыцынскія паслугамі і новымі метадамі лячэння і аздараўлення. Расійскія курорты ў азначаны перыяд яшчэ не маглі скласці канкурэнцыю прыхільнікам вытанчанага адпачынку, так як большасць тых, хто адпачываў за мяжой складалі прадстаўнікі забяспечаных вышэйшых саслоўяў. Нават калі «грымнуў гром з яснага неба і выбухнула над Еўропай ваенная навала, яна застала тысячы і дзясяткі тысяч нашых суайчыннікаў на розных замежных курортах, якія славяцца сваёй маляўнічай прыродай, на марскіх узбярэжжах, сярод горных далін…» [3, с. 86].

Працэс станаўлення і развіцця ўласна турызму, як сацыяльна-эканамічнай, культурнай з’явы і асобнай сферы дзейнасці ў другой палове

XIX – пачатку XX ст. быў абумоўлены мадэрнізацыяй беларускага грамадства [1]. У канцы XIX – пачатку XX ст. пад уплывам працэсаў мадэрнізацыі ў лячэбна-аздараўленчы турызм паступова ўцягваюцца буржуазныя слаі грамадства. Аднак іх фарміраванне ў гэты час яшчэ не завяршылася і ў колькасным выражэнні яны ўступалі чыноўніцтву і дваранству. Не спрыяў развіццю выязнога медыцынскага турызму шэраг грамадска-палітычных, рэлігійных і этнічных абмежаванняў, якія існавалі на тэрыторыі беларускіх губерняў.

## Бібліяграфічны спіс


1. *Зянько, А. Л.* Сацыяльна-эканамічныя перадумовы станаўлення турыстычнай дзейнасці на беларускіх землях у другой палове XIX – пачатку XX ст. / А. Л. Зянько // Научные труды Республиканского института высшей школы: сб. науч. ст. – Минск : РИВШ, 2023. – Вып. 23. Ч. 1. – С. 90 – 98.
2. История белорусской железной дороги. Из XIX века – в XXI век / В. В. Яновская [и др.]. – Минск : Мастацкая літаратура, 2012. – 958 с.
3. *Карагодин, А. В.* «Сделать не хуже, чем за границей»: курорты Южного берега Крыма в годы Первой мировой войны // Исторический журнал: научные исследования. – 2021. – № 4. – С. 83–105.
4. *Кохановский, А. Г.* На пути становления индустриального общества: модернизационные процессы в Беларуси (60-е гг. XIX – начало XX в.) / А. Г. Кохановский // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 3 / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэдактар) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2008. – С. 31–46.
5. *Ловелл, С.* Досуг в России: «свободное» время и его использование / С. Ловелл // Антропологический Форум. – 2005. – № 2. – С. 136–173.
6. *Лядова, А. В.* Медицинский туризм как социальная практика: современное состояние и перспективы развития / А. В. Лядова // Гуманитарные, социально-экономические и общественные науки. – 2017. – №3. – С. 79–82.
7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1293.
8. НГАБ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1868.
9. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1644.
10. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3514.
11. НГАБ. – Ф. 295. Воп.1. Спр. 1373.
12. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 917.
13. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 3. Спр. 134.
14. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 3. Спр. 1567.
15. Свод законов Российской империи издания 1857 г.: в 15 т. – Санкт-Петербург : тип. второго отделения Собственной Его Императорского величества канцелярии, 1857. – Т. 14 : Устав о паспортах и беглых. – С. 1–222.
16. Спутник едущих за границу / сост.: А. Старский. – СПб : тип. Мор. министерства, 1857. – 265 с.
17. *Чернуха, В. Г.* Паспорт в России, 1719–1917 гг. / В. Г. Чернуха. – Санкт-Петербург : Лики России, 2007. – 293 с.
18. *Шыбека, З. В.* Минскъ сто гадоў таму / З. В. Шыбека. – Мінск : Беларусь, 2007. – 304 с.